**Ірына**
**МАЛАШУК**
Кандыдат
філалагічных
навук



# «Ой ты, сонца, сонца краснае...»



илевский государственный уни ерситет имени А.А. Кулешова

Вопыт самастойнага дзяржаўнага жыцця Беларусі засведчыў, што краіна не можа існаваць і паспяхова развівацца без сваёй ідэалогіі. Грамадскасць усвядоміла вострую неабходнасць фарміравання дзяржаўнай ідэалогіі як неабходнай перадумовы ўнутранай стабільнасці, адзінства і росквіту народа. Адначасова ўсталявалася разуменне таго, што ідэйныя каштоўнасці не ствараюцца штучна і адразу, а выспяваюць у ходзе гістарычнага развіцця, вынікаюць з вопыту дзяржаўнага і грамадскага жыцця, адлюстроўваюць духоўныя каштоўнасці народа. Таму сёння, як ніколі раней, адчуваецца неабходнасць пазнання сваіх каранёў і першавытокаў. Адным з важнейшых сродкаў асэнсавання гэтага з'яўляецца даследаванне народных звычаяў і абрадаў.

Самая багатая і самая жывучая абраднасць — вясенняя; да цяперашняга часу з гэтай парой года звязваюць шэраг паўязычніцкіх свят, што даюць багаты матэрыял для аднаўлення старажытнага светапогляду. У ролі птушкі, якая нясе на сваіх крылах вясну, часцей за ўсё выступалі кулік, ластаўка, сівая галка, жаўрук, зязюля і бусел. «Кулік прыносіць з сабою з-за мора дзевяць замкоў, каб зачыніць зіму і адчыніць вясну і цёплае лета; аналагічныя дзеянні прыпісваюцца ў другіх песнях жаўруку і сівай галцы. Але самая сапраўдная вясна — гэта ластаўка; калі яна саўе гняздо на хаце, то гэтай хаце ўвесь год будзе шчасце. Суседнія з нашымі продкамі палякі верылі, што вясной уладар свету пераўтвараецца ў зязюлю і прадказвае кожнаму, колькі гадоў засталося пражыць» *[13. С. 29]*.

## Свяціла «адмыкае зямлю»

На Гомельшчыне вясну пачыналі гукаць яшчэ ў лютым. Акадэмік Я. Карскі лічыў пачаткам яе свята Дабравешчанне (25 сакавіка паводле старога стылю) *[7. С. 251]*. Такое меркаванне праўдзівае: у адной з песень веснавога цыкла знаходзім: «Дабравешчанніко святое, // Пашлі сонейка залатое, // Каб зямелька адышла, // Да вясна да нас прыйшла...» *[5. С. 121]*. Сонца «адмыкае зямлю» ад працяглага зімовага сну.

У веснавым цыкле салярныя матывы нельга лічыць дамінуючымі, на першым месцы знаходзіцца земляробчы культ. Сонца толькі дапамагала або запрашалася нашымі продкамі на дапамогу. Пацвярджэнне гэтаму ёсць і ў М. Нікольскага: «З чаканнем і з'яўленнем вясны звязваўся таксама цыкл разнастайных абрадаў, пераважна магічнага характару. Для земляроба важна, каб вясна не прыпазнілася, прыйшла своечасова; таму з пачатку цяперашняга сакавіка пачыналі "заклікаць" ці "гукаць" вясну, зваць яе» *[13. С. 29—30]*. Надыход яе суправаджаўся традыцыйнымі песнямі і абрадамі. Звычай выпякаць з цеста фігуркі жаўрукоў або буслоў і з'ядаць іх — не што іншае, як паўзабытая мадыфікацыя ахвярнай птушкі, якая, бясспрэчна, існавала ў старажытнасці. Вясну ў вобразе такой птушкі лавілі і прыносілі ў ахвяру богу сонца, а з цягам стагоддзяў і самому сонцу.

У пачатку вясны вялася аграрная варажба па прыкметах. Лічылася, што першыя чатыры дні сакавіка заўсёды прадказваюць надвор'е на ўвесь год, адпаведна: першы — вясна, другі — лета і г. д. У другіх месцах гавораць: «Калі Галдакей (дзень Св. Еўдакіі, 1 сакавіка) цёплы, свеціць сонца, то вясна і лета будуць цёплыя, асабліва добрым будзе сенакос. Калі ідзе дождж, то будзе ўраджай на жыта. Калі моцны мароз, то ён жа памарозіць грэчку ў час цвіцення. Калі першага сакавіка дзень туманны, то будзе ўраджай на стручковыя расліны; калі ж мяцеліца і завея (што, па словах сялян, бывае рэдка), то ў бягучым годзе патрэбна чакаць моцнага голаду, які выкасіць людзей» *[9. С. 90]*.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

З надыходам вясны звязаны рэдкія ў славян касмалагічныя павер'і аб штогадовым стварэнні Сусвету. Лічылася, што сонечны бог, народжаны ў дзень зімовага сонцапавароту, у веснавое раўнадзенства памірае і зноў уваскрасае і ўзносіцца на неба, каб перадаць сваю моц і новую сілу будучым пладам. Для міфалогіі ранневясенняга цыкла ў аднолькавай ступені значная як сімволіка пачатку, так і сімволіка аднаўлення, якія не заўсёды нават можна правільна размежаваць, бо ўсё залежала ад «паводзін» сонца. З абуджэннем жыцця і прыроды атрымлівалася, што нібыта аднаўлялася і гэтае свяціла. Яно быццам бы зноў нараджалася пасля зімовага «памірання». Падобны матыў сустракаецца і ў калядным абрадзе, аднак такі паўтор цалкам апраўданы, бо ў старажытнасці пачатак года адзначаўся першага сакавіка і, вядома ж, быў звязаны найперш са становішчам сонца на небе.

З міфалагічнай тэмай стварэння (аднаўлення) Сусвету спалучаны, хутчэй за ўсё, і такі традыцыйны для ранняй вясны звычай, як пабелка жылля. У гэтым можна ўбачыць асацыяцыю штогадовага зараджэння «белага свету», які пачынаўся пры актыўным удзеле сонца.

У асобных рэгіёнах да ранневясновых дат прымеркавана, здаецца, тыпова калядная варажба аб жыцці і смерці. У аснове яе таксама ляжыць паміранне і ажыванне сонца. «На Віцебшчыне, напрыклад, традыцыйная калядная варожба з лыжкамі (чыя лыжка за ноч перавернецца, той не дажыве да наступных Каляд) адбываецца ў масленічнае загавенне. У сербаў Алексінацкага Памараўя вечарам на масленіцу члены сям'і, седзячы за сталом, спрабавалі ўбачыць на сцяне ўласны цень: калі цень быў без галавы, то гэта прадказвала ім хуткую смерць» *[1. С. 139]*.

У кантэксце тэмы веснавога «новачасу» і адроджанага сонца характэрныя звычаі, якія тычацца распазнавання або варажбы адносна долі — індывідуальнага лёсу чалавека, таго, як ён будзе жыць увесь наступны год. Гэтаму прысвечаны «балканаславянскі звычай, аналагічны ўсходнеславянскаму "кусанню каліты" (звычай называўся ламкане, хамкане, ацкане і інш). Гаспадар ці гаспадыня падвешваюць на нітцы хлеб, яйка, халву, яблык, сыр ці што-небудзь іншае, прымацоўваюць нітку другім канцом да сталёвай бэлькі і моцна разгойдваюць яе (нітку.— *І. М.*). Астатнія члены сям'і ... імкнуцца адхапіць сабе кавалачак шчасця ці долі... у балканскіх славян матыў "адкусвання долі" на наступны год звязаны з пачаткам вясны, перыядамі з'яўлення актыўнага сонца» *[1. С. 139—140]*.

## Вялікдзень — вялікі дзень

Самымі вялікімі веснавымі святамі былі Вялікдзень, Юр'я і Сёмуха, што ўбіралі ў сябе некаторыя будзённыя этапы ў жыцці і працы селяніна. Апроч іх адзначаліся і некалькі менш значных, якія таксама суправаджаліся адпаведнымі абрадамі, мелі свае звычаі, павер'і і выконвалі, паводле меркавання земляроба, пэўныя традыцыйна-жыццёвыя функцыі.

За тыдзень да Вялікадня святкавалі Вербніцу. Кожнага сустрэчнага «білі» асвячонай голькай вярбы, прыгаворваючы пры гэтым: *«Не я б'ю, вярба б'е, за тыдзень — Вялікдзень. Хвора ў лес па верас, а здароўе ў косці»*. Напэўна, гэта звязана з вераваннем, што распушчаная вярба, якая ажыла («адрадзілася»), увабрала ў сябе сілу, моц дзённага свяціла і, дзякуючы такому магічнаму дзеянню, перадае іх чалавеку.

Адам Багдановіч меркаваў, што гэта святкаванне азначала «надыход вялікіх дзён панавання сонца і пачатку сезона палявой працы, дзён, якія прысвячаліся сонцу і іншым багам ратайства, уласцівасці якіх былі значна пазней перанесены



Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

на хрысціянскіх святых» *[3. С. 107—108]*. У розных месцах славянскага рэгіёна сустракаюцца сведчанні пра тое, што на Вялікдзень сонца некаторы час знаходзіцца на небе нерухома, таму і ўзнікла назва «Вялікдзень» — вялікі доўгі дзень. Раніцай на першы дзень свята хадзілі сачыць «ігру сонца: назіралі за яго ўсходам з узгоркаў, стрэх, званіц. З'яўленне сонца на чыстым небе і "ігра" яго прадвяшчалі добрае, спрыяльнае для земляроба лета, багаты ўжон, шчаслівыя вяселлі» *[10. С. 10]*. Павер'е аб «ігры сонца», дарэчы, вядомае па ўсёй Еўропе.

Гэта не што іншае, як каляндарны цуд, які азначае *свята ўвогуле*, нейкі зусім акрэслены стан Сусвету. Аднак каляндарны цуд — толькі частковы. Паводле фальклорнай логікі, у святочны дзень ці ноч сапраўды адбываюцца незвычайныя з'явы, але ўсе яны загадзя вядомы і здараюцца з году ў год. Тым не менш, цуд ад гэтага не становіцца менш жаданым.

«У славенскім фальклоры з'яўленне некаторых цудоўных прадметаў звязана з сюжэтам аб нябёсах, што адчыняюцца ў святочную ноч... ва ўсходняй Штырыі ў перадвялікодны чацвер па палях шукалі *«taranbalto»* — чароўную сякеру, якая (як грамавая страла) падае на зямлю ў час навальніцы, глыбока ўваходзіць у зямлю і з'яўляецца на паверхні толькі праз сем гадоў, у перадвялікодны чацвер. Калі знайсці такую сякеру і пакласці яе пад страху, маланка не стукне ў хату, а каровы будуць даваць больш малака» *[1. С. 572]*. А Чысты чацвер, як і ўвогуле ўсе салярныя вялікодныя дні, спалучаўся з магічнымі ачышчальнымі дзеяннямі. У першую чаргу гэтаму падлягаў посуд для замешвання і заквашвання цеста. На Палессі, у асобных раёнах Беларусі і ў паўднёвярускіх рэгіёнах да ўсходу сонца дзяжу старанна выскрабалі, адмывалі, націралі соллю і часнаком, падкурвалі воскам і хмелем, а затым перавязвалі ручніком і выстаўлялі на двор, каб яна «сонца пабачыла», увесь год была «чыстай» і ў ёй удаваўся хлеб. «Пад сонца» траплялі і іншыя рэчы бытавога ўжытку з мэтай надання ім магічных уласцівасцей. Такім чынам у свята чалавек атрымліваў асаблівую магчымасць сілай далучэння да сонечнага святла нават пераўтварыць у некаторай ступені навакольны свет, зрабіць яго жаданым для сябе.

Ачышчальнае значэнне мелі і вялікодныя вогнішчы, якія таксама перакліказліся з салярнымі сімваламі. П. Шэйн сведчыў: «Сяляне Мінскай губерні... у Вялікую Суботу ноччу здабываюць агонь штучным спосабам, гэта значыць трэннем дзвюх палак — адна аб другую, затым раскладваюць вогнішча і запальваюць яго здабытым адзначаным спосабам агнём і праводзяць праз яго рагаты скот, свіней і іншых свойскіх жывёл з поўнай упэўненасцю, што гэтым яны пазбаўляюць усю сваю свойскую жывёлу ад хваробы і ўсяго дрэннага на цэлы год» *[15. Т. 1. С. 330]*.

Вялікае рытуальнае значэнне ў час Вялікадня надавалася ежы. У язычніцкія часы яна мела пэўны абрадавы сэнс. Застолле распачыналі чырвоным яйкам. Яно мела, бясспрэчна, патрыярхальнае абрадавае прызначэнне. Яйка лічылася ўвасабленнем жыццядайнага пачатку. «Яйка чырвонае і Сусвет ад сонца чырвоны»,— сцвярджалі ў народзе. Няцяжка прасачыць адпаведнасць паміж абрадавым яйкам і маладым адроджаным сонцам. На гэту акалічнасць звяртае ўвагу А. Ліс: «Семантыка чырвонага яйка ў валачобных абрадах і звычаях узыходзіць да старажытных вераванняў, уласцівых многім народам, аб жыццядайным пачатку, заключаным у ім. Гэта знайшло стыхійна-матэрыялістычнае пераасэнсаванне ў звычаі, пашыраным на Палессі, калі на велікодны стол ставілі гаршчок насення, нарыхтаванага на засеў, а ў яго дзеля магічнай стымуляцыі росту клалі чырвонае яйка» *[10. С. 10]*.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Хрысціянства, пераасэнсоўваючы язычніцкую сімволіку, у адпаведнасці са сваімі ўяўленнямі і догматамі, тлумачыць ужыванне чырвоных яек у рэлігійных абрадах як далучэнне да радасці ў сувязі з уваскрэсеннем Хрыста.

## Амаль няма аналагаў

Адметнай рысай велікоднага абраду было і хаджэнне валачобнікаў, якія не міналі ні панскай гасподы, ні запушчанага падворка ўдавы, апошняга вясковага бедняка: усіх віталі песняй, жадалі гаспадару і ўсім яго сямейнікам добрай долі, здароўя, спору на ніве і ў хаце. У песнях абавязкова згадвалі і «яснае сонейка». Дарэчы, валачобныя песні, займаючы прыкметнае месца ў сістэме жанраў беларускай народнай паэзіі, амаль не маюць аналагаў у фальклоры суседніх славянскіх народаў.

Радасць, якую неслі абуджэнне прыроды, прыход цёплых дзён, заўсёды звязвалася і з іншымі клопатамі пра ўраджай. Відавочна, што Вялікдзень быў днём варажбы пад яго. Па прыкметах надвор'я імкнуліся прадказаць, спрыяльны ці неспрыяльны будзе год. Валачобнікаў чакалі як вестуноў ураджаю, а іхняе з'яўленне параўноўвалася з прыходам доўгачаканага сонца.

Тое, што валачобныя песні прымяркоўваліся да пачатку земляробчага года, безумоўна, у многім садзейнічала ўзмацненню ў іх матываў пажадання на будучае. Змест гэтых твораў вылучаецца нейкай асаблівай добразычлівасцю, душэўнай шчодрасцю, у іх увасоблены лепшыя рысы беларуса. «Апагею велічання гаспадара, яго двара, нівы дасягаюць валачобнікі ў песні "Пане гаспадару, слаўны мужу", у якога "дварочак, як вяночак", "вароценькі маляваны", "зашчэпкі пазлачаныя", на іх "сонца адбіваецца", "золатам пераліваецца". Хата паўстае кілімам, які "золатам крыты, срэбрам літы, прыбрамачкі срэбраныя, зашчэпачкі залаценькія". У залатым крэсле "сам Бог сядзіць"» *[6. С. 106]*. Вядома ж, «сам Бог» тут з'ява значна пазнейшая, чым велічная постаць раннеязычніцкага боства — Сонца.

У адной з валачобных несень пазначаны канкрэтныя заняткі кожнага са святых, а салярны культ прасочваецца праз іх залатыя аздобы: «А ў том шатре залатое кресло, // На том кресле самъ Бог сядзіць, // Перед Богом усе Святыі // Шыкуются, рахуются... Святый Юрій, Божій пасол, // Да Бога пашов, // А взяв ключы залатые, // Атамкнув землю сырусенькую, // Пусців расу цяплюсенькую // На белый свет і на ввесь свет... Святый Мікола па межам ходзіць, // Жыта родзіць, // Урасівся, умачівся, // Под залатый пояс адаткнувся... Святый Кузьма сярпы робіць (залатые, новые і сталёвые)...» *[15. Т. 1. С. 108—109]*.

Таксама матыў золата, у прыватнасці залатога пярсцёнка, гучыць і ва «ўласна велікодных песнях:

> Стаіць вярба сярод двара,
> Лалым — лалым — лалым!
> На тый вярбе залатая раса і г. д.

Птушкі збілі расу, дзяўчына падабрала яе і прынесла да майстра, які зрабіў для яе тры рэчы: залаты пярсцёнак, пярловы вянок і шаўковы дыван; усё гэта прызначаецца для вяселля» *[7. С. 260]*.

Народжаныя патрэбай спрыяць чалавеку словам: заклінаннем, варажбою,— валачобныя песні па меры пераасэнсавання сваёй зыходнай функцыі, набыцця віншавальна-велічальнага прызначэння атрымлівалі ўсё большае канкрэтна-вобразнае, сімвалічна-гуманістычнае напаўненне.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

## Юрый залаты ключ прыносіць

Адпаведна старажытным уяўленням, сонца вясною «маладое», і адным з ягоных адлюстраванняў у язычніцкія часы з'яўляўся бог Ярыла (у балтыйскіх славян Яравіт, Геравіт), ад праславянскага кораня яр, суаднесенага з урадлівасцю, узнаўленнем (яры, ярына, ярыцца). У славянскай міфалогіі бог урадлівасці, увасабленне параджальных сіл прыроды. Пасля прыняцця хрысціянства трансфармаваўся ў міфалагічны персанаж веснавых магічных абрадаў. Спалучае прыкметы і функцыі антычных Дыяніса і Эраса, салярнага і хтанічнага боства. Да XVIII ст. выцеснены рытуальна-міфалагічным фалькларызаваным вобразам *Юрыя* (Ягорыя, Святога Георгія).

У беларускай каляндарнай абраднасці адбылося спалучэнне святаў Ярылы і Святога Юрыя, культавыя функцыі першага перайшлі да другога. «Юрый, Георгий (рус.), Георгий Победоносец (царкоўнаслав.), Джырджыс (мусульм.). Усе яны знаходзіліся пад апякунствам сонца, якое ішло следам за гэтымі рэлігійнымі персанажамі з эпохі язычніцтва.

Сакральна-паэтычны вобраз сонечнага Юрыя ў беларускім фальклоры выступае ў ролі пачынальніка вясны. Гэта ён прыносіць залаты ключ, каб адамкнуць жыццядайную нябесную расу і пусціць яе на зямлю» *[8. № 5. С. 29]*, каб там яе нагрэла сонца, узбагаціла гаючай сілай. У адной з валачобных песень знаходзім: «Святы Юрый, божы ключнік, // Асядлаў каня варанога, // А сядзельца залатое, // Узяў ключы залатыя, // Паехаў у поле, // Адамкнуў расу мядовую, // Расу мядовую, траву шаўковую...» *[4. С. 83]*. Можна прасачыць і сувязь Юрыя з сонечным пачаткам. Гэты матыў мае агульнаславянскія карані. Так «у Штырыі было вядома аб залатых прадметах, якія падалі на зямлю з сонца ў Юр'еў дзень. Сярод іх: залаты сонечны сподачак, які асвятляе ўсё ў хаце; цудоўнае люстэрка, паглядзеўшыся ў якое чалавек убачыць тое, што адбываецца ў свеце...» *[1. С. 572]*.

Як сонца сваім цяплом апладняе зямлю, што садзейнічае добраму ўраджаю, так і Юрый залатымі ключамі «адмыкае зямлю», «пускае расу». На Юр'я першы раз выганяюць жывёлу ў поле. Пры гэтым да Юр'я і да сонца (зноў традыцыйны прыём двухвер'я) звяртаюцца з малітвамі, песнямі і замовамі: «...і сушу і мора асічаеш, і маць сыру зямлю ўграваеш і з вясеннім цяплом і з летнім агнём і ўгрэй, упар сыру зямлю, распусці зялёну траву па лясам, па лугам, па канавам, па кустам» *[15. Т. 1. С. 552—553]*.

Адбіткі старажытнага светапогляду захоўваюцца і ў абрадзе ачышчэння агнём жывёлы ў час выгану. Не выключана, што на першапачатковым этапе гэты агонь спалучаўся з салярным вогнішчам («кастром»). «...Абрадавасць на Юр'я цесна звязана з велікоднай, і таму гэты абрад заслугоўвае нашай асаблівай увагі. Жывёлу ў хляве перад выганам абходзяць з запаленай свечкай... пры гэтым кожная жывёла атрымлівае ўдар вярбой, захаванай ад вербнай нядзелі. Ужыванне свечкі з'яўляецца, зразумела, пазнейшай навіной; першапачаткова ачышчэнне рабілі проста распаленым вуголлем» *[14. С. 257]*.

Такую абарону і ачышчэнне жывёлы агнём (полымем), а потым яшчэ і дымам ад усемагчымых паморкаў і пошасцей выкарыстоўвалі і ў час хваробы жывёлы: «Пры з'яўленні падзяжу жывёлы дзеля пазбаўлення ад гэтай бяды выбіраецца па ўзаемнай дамоўленасці дзень, у які прытрымліваюцца ўсе шчырага посту, паміж тым жанчыны імкнуцца на працягу гэтага дня напрасці нітак і з іх саткаць кавалак палатна, чым даўжэй, тым лепш. К вечару гэта палатно развешваюць дзе-небудзь у канцы сяла ў завулку паміж агароджаю з аднаго і другога боку, уперадзе яго раскладваюць вогнішча, якое запальваюць

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

агнём, здабытым пры дапамозе трэння двух асінавых калоў, і потым пад развешанае палатно і праз палаючае вогнішча праганяюць жывёлу. Пры гэтым заўважаюць тую жывёлу, якая не пройдзе праз вогнішча, і лічаць яе страчанай для гаспадаркі, імкнуцца хутчэй збыць яе з рук» *[15. Т. 3. С. 331]*.

Пакланенне сонцу праяўлялася ў святочным і будзённым жыцці земляроба, таму менавіта на Юр'я пачыналі ворыва. Перад выездам у поле валоў (каня) і саху асвячалі. Цікавы звычай П. Шэйн зафіксаваў у Гродзенскай губерні: сяляне не пачыналі вясной араць зямлю чорным валом, а прасілі ў суседа пазычыць вала іншай масці *[15. Т. 3. С. 16]*. Перавага жывёлам белай масці аддавалася нездарма. Прыгадаем прыкмету, па якой прадказвалася надвор'е: «Пастух гоніць статак дадому, калі ўперадзе ідзе карова белай масці — гэта знак, што на наступны дзень можна чакаць выдатнага надвор'я; калі ж паперадзе ўсіх бачаць карову чорную, то і надвор'е, адпаведна, будзе пахмурнае» *[9. С. 97]*. Белы колер — колер сонца. У дадзеным выпадку мае ён моцную магічную ўласцівасць — прадказваць добрае надвор'е.

Рэч у тым, што земляробчая культура абавязкова павінна была своеасабліва паўплываць на склад народнага светапогляду, падпарадкоўваючы жаданні і памкненні чалавека ўладзе зямлі, звязваючы ўсё гэта з залежнасцю ад сонца. Паступова гэтае механічнае асацыятыўнае ўспрыманне перайшло ва ўсвядомленае, традыцыйна-магічнае. Таму, напрыклад, у дзень ворыва нашы продкі абыходзілі свае нівы з асвячонай вярбой і свечкай, якія першапачаткова былі атрыбутамі ачышчэння. У раннія часы гэта рабілі з запаленай свечкай і абмахвалі палетак вярбой, каб адагнаць злых духаў, як і ля свяшчэнна-ачышчальнага вогнішча, ці калі функцыю грознага абаронцы выконвала сонца. Такім чынам відавочна, наколькі цесна перапляталіся паміж сабой земляробчы і салярны культы ў старажытным светасузіранні.

Увасабленнем земляробчага і сонечнага пачаткаў з'яўляецца і абрадавы хлеб, салярны сімвал урадлівасці і пладнасці з выявамі *Сусветнага Дрэва* і яго элементаў (птушак, жывёл і інш.). Як адзначае А. Лозка, «са спецыяльным хлебам выходзяць сустракаць вясной птушак, а на Тураўшчыне і ў некаторых прылягаючых раёнах клікалі вясну на полі ці на стозе сена з упрыгожаным караваем» *[11. С. 108]*. Даследчык акцэнтуе ўвагу на тым, як вадзілі карагоды на Юр'я на старажытнай Тураўшчыне. «Як і пры калядаванні ці валачобных абходах, удзельнікі з пірагом і харугваю падыходзлі пад вокны хат і "заводзілі карагодка". Несумненна, гэтым магічным дзеяннем імкнуліся садзейнічаць пладароддзю нівы, у асноўным ярыны, улагодзіць Ярылу — сына Лады і Дажджбога (сонца). У святочным карагодзе хлопцы і дзяўчаты браліся за рукі, утвараючы кола» *[12. С. 7]*. Падчас «карагодка» хлопцы з'яўляліся на конях, як Пярун і Ярыла ў беларускай міфалогіі, выязджаючы на нябеснае кола-шлях, акрэслены сонцам. А. Афанасьеў адзначаў: «У некаторых рэгіёнах Расіі выбіраюць на Юр'еў дзень прыгожага хлопца, апранаюць яго ў зелень і кладуць яму на галаву круглы пірог, упрыгожаны кветкамі; з запаленым факелам у руцэ ён нясе гэты пірог на поле, а наступны за ім хор дзяўчат спявае ў гонар Юрыя абрадавыя песні. Так абходзяць яны тройчы вакол засеяных ніў; пасля чаго разводзяць вогнішча, якое падобна на кола, і пасярэдзіне яго пакідаюць пустое месца, куды кладуць прынесены пірог. Усе рассаджваюцца каля агню, піруюць і дзеляць паміж сабой пірог...» *[2. С. 706]*. Факел таксама азначае сувязь з небам і з'яўляецца ачышчальна-магічным прадметам (прыгадаем сувязь агню з сонцам). У тураўскім абрадзе замест факела чырвоная тканіна выконвае тую ж функцыю.

Тураўскі «карагодак», у якім спалучаюцца язычніцкі і хрысціянскі пачаткі, прасякнуты салярным культам, як і ўся магія і творчасць каляндарна-абрадава-



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

га веснавога цыкла. Аналіз яго значна дапаўняе нашы ўяўленні аб абрадавасці, прысвечанай адроджнаму веснавому сонцу, яго ачышчальнай, жыццядайнай і ўрадлівай сіле.

■

Такім чынам, першавобраз сонца звязаны з архаічнымі ўяўленнямі аб барацьбе светлых і цёмных сіл за валадаранне, у выніку чаго адбываецца перарастанне першаснай сутнасці (клопату аб бяспецы і карысці) у катэгорыю псіхаментальную, эстэтычную, калі ўсё светлае, яснае, як узыходзячае сонца, становіцца абазначэннем прыгожага, цудоўнага, падмацаванага рытуальнымі дзеяннямі і словамі. Адбітак салярнага культу ў светапоглядзе вечнага працаўніка ўзмацняе гэты гуманістычны пачатак уяўленнямі аб анімізаваным сонцы і, дапасаваўшыся да земляробчага культу, дапаўняе старажытныя ўяўленні пра навакольны свет, прадметы і з'явы якога ўяўляюцца па аналогіі з жыццём чалавека.

ЛІТАРАТУРА


1. Агапкина Т. А. Мифологические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл. М., 2002.

2. Афанасьев А. Н. Поэтические воззрения славян на природу: В 3-х т. М.: «Индрик», 1994—1995. Т. 1—3.

3. Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: Этнографический очерк (Репринт. изд.). Минск: Беларусь, 1995.

4. Валачобныя песні / Склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей; склад. муз. часткі В. І. Ялатаў. Мінск: Навука і тэхніка, 1980.

5. Веснавыя песні / Склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей; склад. муз. часткі В. І. Ялатаў. Мінск: Навука і тэхніка, 1979.

6. Казакова І. В. Міфалогія і магія ў беларускім абрадавым фальклоры. Мінск: ВКП «БОФФ», 1997.

7. Карскі Я. Беларусы. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001.

8. Конан У. М. Архетыпы нашай культуры // Адукацыя і выхаванне. 1996. № 1, 3—11.

9. Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. М., 1874.

10. Ліс А. С. Валачобныя песні. Мінск: Навука і тэхніка, 1989.

11. Лозка А. Ю. Веснавы «карагодак» на Тураўшчыне // Беларуская літаратура, вып. 17. Мінск: Універсітэцкае, 1989.

12. Лозко А. Ю. Обрядовая поэзия белорусского Восточного Полесья (Современное состояние, остатки древних верований): Автореф. Дис. ...канд. филолог. наук. Мінск, 1990.

13. Никольский Н. М. Дохристианские верования и культы днепровских славян. М.: Атеист, 1929.

14. Нікольскі М. М. Міфалогія і абрадавасць валачобных песень. Мінск, 1934.

15. Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края // Сб. Отделения русского языка и словесности АН. СПб. 1887—1902. Т. 1—3.


Бабруйск

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова